Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЛЮТАГА 2018 г. СЕРАДА № 41 (28657)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ШЧЫРАЕ СЛОВА КНІГІ

***Удзельнікам XXV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу і IV Міжнароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час»***

**Дарагія сябры!**

Сардэчна вітаю ўдзельнікаў і гасцей XXV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу і IV Міжнароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час».

Гэты форум па праве лічыцца адной з найбольш яркіх падзей у жыцці Беларусі. За чвэрць стагоддзя ён набыў шырокую вядомасць і за межамі нашай краіны.

Духоўна-маральнае развіццё грамадства з'яўляецца найважнейшай задачай беларускай дзяржавы. Немалаважную ролю ў гэтым, безумоўна, адыгрывае кніга.

Цяжка пераацаніць яе значэнне ў захаванні культурнай спадчыны пакаленняў, фарміраванні асобы і выхаванні патрыятызму, адукацыі і руху да прагрэсу.

Выключна важна, каб сумленнае і пранікнёнае слова пісьменніка заклікала да міру, узаемаразумення і гуманізму.

Жадаю ўсім плённай працы, творчых поспехаў, шчасця і дабрабыту.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей КАЛЕЧЫЦ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Па стаўцы рэфінансавання тыя прагнозы, якія ёсць у асноўных напрамках грашова-крэдытнай палітыкі, ужо агучваліся — да 9,5 % на выніках года. Мы лічым, што сітуацыя дазволіць нам выйсці на гэты ўзровень. Удакладню, што рашэнне аб тым, які канкрэтна крок змянення стаўкі рэфінансавання будзе прымяняцца, будзе залежаць ад эканамічнай сітуацыі. Вядома, паявілівацца крок наўрад ці будзе, але ў плане змяншэння гэта цалкам магчыма, таму што мы ўжо наблізіліся да такіх разумных лічбаў, калі пачынаюць дзейнічаць узроўні тонкай настройкі. Калі і наколькі будзе зніжацца стаўка рэфінансавання — гэта пытанне тактыкі Нацбанка. Кожны раз мы прымаем ці не прымаем рашэнне ў залежнасці ад таго, як ацэньваецца цэлы комплекс фактараў, сітуацыя на рынку».*

ISSN 1990 - 763X

# АГУ, ВЯСНА!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхарка вёскі Даўгаполле Гарадоцкага раёна Валянціна ШЭНДЗЕЛЕВА чакае прыходу вясны ў сваёй па-веснавому аздобленай хаце.**

■ Чалавек і справа

## «Чым больш атрымліваеш, тым больш траціш»

**21-гадовы даяр расказаў аб зарплаце ў 1700 рублёў**



Фота Анастасіі ГРУК.

**Нашу ўвагу заўсёды прываблівающь незвычайныя рэчы і з'явы. А цікавасць да людзей узнікае тады, калі яны чымсьці не падобныя да іншых: сваімі захапленнямі ці прафесійнай дзейнасцю, напрыклад.**

СТАР. 9

## СЛУЖБА «112» СЛУХАЕ

Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

### ЯК ПРАЦУЮЦЬ ДЫСПЕТЧАРЫ МНС

**У цэнтры Мінска ёсць невялікі двухпавярховы будынак, схаваны ад вачэй цікаўных мінакоў. Гэта — святая святых Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС, Цэнтр аператыўнага рэагавання. Тут працуюць дыспетчары, якія штодня прымаюць тысячы тэлефонных званкоў аб надзвычайных сітуацыях, што адбываюцца ў межах двухмільённага мегаполіса. На іх першымі кладзецца ўвесь псіхалагічны цяжар службы ратавальнікаў.**

Мы гутарым з **дыспетчарам Цэнтра аператыўнага рэагавання Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Крысцінай ГІЛЕВІЧ.** Здаецца, хвіліны не праходзіць, каб на селектары не загарэлася чырвонае святло, не прагучаў чарговы тэлефонны званок і не пачуўся голас дыспетчара — «Дзяжурная служба МНС. Чым вам дапамагчы?» Дзяўчына працуе дыспетчарам не так даўно — тры месяцы. Але ўжо і за гэты час ёй ёсць што расказаць.

— Так, днём не бывае і пяці хвілін, каб мы пасядзелі ў спакоі, без званкоў. Увогуле, працоўная змена пачынаецца а восьмай раніцы і доўжыцца суткі. У пачатку змены мы прымаем ад папярэдніх страявыя запіскі аб наяўнасці людзей і тэхнікі ў падраздзяленнях. Гэта трэба для таго, каб правільна размяркоўваць пераадрасаваныя выклікі. Але на гэты час работа, вядома, не спыняецца, і мы прымаем званкі... Спачатку апрацоўваць іх было крыху страшна, бо не ведаеш, чаго чакаць. Але работа ёсць работа.

***— Ці шмат да вас трапляе званкоў не па адрасе?***

— Мы да іх ставімся не вельмі добра. Яны нам «засмечваюць» лінію. Пры гэтым у іншым месцы можа адбывацца пажар, дзе спатрэбіцца наша дапамога. Вось літаральна некалькі дзён таму я прыняла званок, падчас якога прасілі... разблакаваць сім-картку мабільнага тэлефона. Здавалася б, якое дачыненне да гэтага маюць ратавальнікі? Але справа ў тым, што нумар 112 будзе даступны з мабільніка заўжды, незалежна ад таго, актыўная там сімка ці заблакавана. Гэта міжнародны стандарт.

СТАР. 4